Справы тваіх аднагодкаў

# Ветэраны будоўлі вялікай хіміі

Далёка за межамі Беларусі ведаюць аб першынцу беларускай хіміі — Салігорскім калійным камбінаце. З кожным днём расце горад беларускіх шахцёраў. Паверх за паверхам узнімаюцца новыя добраўпарадкаваныя дамы, асфальтуюцца вуліцы і тратуары, пракладваюцца падземныя інжынерныя збудаванні. А непадалёку ад горада будаўнікі маладога калектыву будаўнічага ўпраўлення № 122 узводзяць аб'екты першага калійнага камбіната.

Ужо ў снежні яны павінны ўвесці ў строй дзеючых першую чаргу камбіната. Сярод першачарговых пускавых аб'ектаў у цяперашні час — машынны будынак, надшахтавае збудаванне шахты № 1, солямлын, склад сільвініту і сырой солі, некалькі перагрузачных вузлоў і транспартных галерэй.

Нягледзячы на маладосць калектыву будаўнікоў, які стварыўся пяць гадоў таму назад, ва ўпраўленні выраслі цудоўныя людзі, якія паказваюць выдатныя ўзоры працы, сістэматычна перавыконваюць свае зменныя заданні і з'яўляюцца прыкладам для ўсяго рабочага калектыву.

Вось трое такіх радавых будаўнікоў, маякоў калектыву, якія прыйшлі на будоўлю камсамольцамі, а цяпер сталі сталымі кіраўнікамі брыгад і ўчасткаў, майстрамі будаўнічай справы.

Іван Чабатар нарадзіўся і вырас у вёсцы Півашы, якая знаходзіцца побач з горадам хімікаў. Вучыўся ў школе. Закончыў будаўнічае вучылішча, працаваў цесляром, служыў у радах Савецкай Арміі. Там ён і даведаўся, што на радзіме ўзводзіцца калійны камбінат і новы горад. Рашэнне прыйшло адразу: пасля дэмабілізацыі — у Салігорск, на будоўлю.

У студзені 1959 года Іван Пятровіч стаў працаваць радавым цесляром ва ўпраўленні. На рабоце яго адразу прыкмецілі. Усё ў яго рабілася хутка, спрытна і якасна.

А праз тры месяцы яго назначылі брыгадзірам комплекснай брыгады. Калектыў падабраўся дружны, усе працавалі з натхненнем. Па выніках працы брыгадзе Івана Чабатара першай у горадзе было прысвоена званне калектыву камуністычнай працы. Сам брыгадзір удастоіўся гонару быць удзельнікам першай Усесаюзнай нарады перадавікоў руху за камуністычную працу. Урад высока ацаніў яго працоўныя справы, узнагародзіўшы медалем «За працоўную адзнаку». У 1960 годзе перадавы будаўнік Іван Пятровіч Чабатар быў прыняты ў члены Камуністычнай партыі. Сёлета камуністы выбралі яго партгрупоргам участка, а калектыў будаўнікоў двойчы выбірае яго членам будаўнічага камітэта трэста. Цяпер брыгада Івана Чабатара працуе на ўзвядзенні цэха змешаных солей, які павінен уступіць у дзеянне ў снежні гэтага года.

Заслужанай павагай карыстаецца таксама брыгадзір брыгады камуністычнай працы Анатолій Бялько. Брыгада, якой ён кіруе, сфарміравалася ў ліпені 1958 года. Многа слаўных спраў на яе рахунку. У гэтым калектыве склалася добрая традыцыя: самім вучыць для сябе спецыялістаў. Сам брыгадзір падрыхтаваў 8 муляраў. А нядаўна камуністы ўпраўлення прынялі яго кандыдатам у члены КПСС.

Ветэранам салігорскай хімічнай будоўлі з'яўляецца самы малады будаўнік— Васіль Нікіценка. Яму 22 гады. Нарадзіўся ён у вёсцы Гарбацэвічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. У 1942 годзе яму было толькі тры гады, калі яго бацька загінуў на фронце. Закончыўшы сярэднюю школу, паступіў у будаўнічае вучылішча, якое скончыў у 1958 годзе. Па пуцёўцы камсамола прыехаў будаваць калійны камбінат. Спачатку працаваў мулярам. Вучыўся на курсах брыгадзіраў, а пазалетась прыняў комплексную брыгаду. Брыгада, якую ён узначальвае,— камсамольска-маладзёжная.

А. ВАСІЛЕВІЧ,
сакратар партарганізацыі будаўнічага ўпраўлення № 122.